# Вучымся пісаць водгук: комплексны аналіз тэксту

**Т. К. Пільчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 1 г. Ліды

- Водгук – адно з самых цяжкіх конкурсных выпрабаванняў. Падрыхтоўка пачынаецца з урокаў беларускай мовы і літаратуры, калі мы знаёмімся са структурай тэкстаў, лексічнымі, сінтаксічнымі сродкамі стварэння мастацкага вобраза.

Без перабольшання, водгук на мастацкі твор належыць да найбольш складаных і адказных конкурсаў алімпіяды па беларускай мове як для вучняў і настаўнікаў, якія займаюцца падрыхтоўкай каманд, так і для членаў журы. Гэта абумоўлена творчым характарам конкурсу, а творчасць, як вядома, у адрозненну ад канкрэтыкі лінгвістычных заданняў заўсёды надзвычай цяжка перакласці на мову лічбаў. Тым не менш рабіць гэта даводзіцца.

Усведамленне ролі гэтай формы працы ва ўзбагачэнні маўлення, у развіцці творчых здольнасцяў вучняў прывяло да асэнсавання водгуку як асобнага маўленчага твора. У сучасных тэрмінах лінгвістыкі тэксту *водгук характарызуецца* як маўленчы твор, заснаваны на выяўленні эмацыйна-ацэначных адносін да прачытанага, убачанага, пачутага.

І тут водгук як адзін з этапаў алімпіяды па беларускай мове нагадвае, мабыць, рэцэнзію і анатацыю, якая прадугледжвае каментаванне асноўных палажэнняў:тлумачэнне аўтарскай думкі; уласныя дапаўненні да думкі, выказанай аўтарам; выражэнне сваіх адносін да пастаўленай аўтарам праблемы; абагульненую аргументаваную адзнаку; вывады аб значнасці твора, прапанаванага для напісання водгуку.

Водгук як жанр выказвання патрабуе ад вучня дэманстрацыі ведаў па тэорыі вершаскладання і спецыфіцы літаратурнага працэсу, умення сцісла і па-навуковаму дакладна інтэрпрэтаваць змест, тэму, ідэю прапанаванага твора (празаічнага або вершаванага), выяўляць уласнае стаўленне да сістэмы моўных сродкаў, за якой стаіць асоба паэта і пры дапамозе якой перадаюцца аўтарскія пошукі, разважанні, перажыванні.

Дзейнасць па напісанні водгуку патрабуе творчасці, выяўляе чытацкі вопыт вучня, дэманструе агульны ўзровень духоўнай і маўленчай культуры асобы, ступень яе далучанасці да мастацтва, разуменне пабудовы мастацкага тэксту.

Алімпіядная група рознаўзроставая, што дае магчымасць дзяліцца вучням старшых класах напрацаваным вопытам з малодшымі, карэкціраваць іх працы, дапамагаць пры аналізе мастацкіх тэкстаў.

**Тэма ўрока “Простае шчасце людское…”**

**Ход урока**

*Праверка дамашняга задання.*

– На працягу некалькіх заняткаў мы адпрацоўвалі прыёмы напісання водгукаў. Якія ёсць прылады у руках паэта, пісьменніка для сварэння мастацкага вобраза?
– Якія вы знайшлі прыёмы ў прапанаваных урыўках?
- Падкрэсліце словы, пры дапамозе якіх дасягаецца экспрэсіўнасць мовы паэтычнага радка. Запішыце назву адпаведнага тропа ці сінтаксічнага прыёму.

| № | Сказы | Назва тропа, прыёму |
|---|---|---|
| 1 | Гэтая сарока лётала далёка, за шырокае мора, за высокія горы. | |
| 2 | Мішку сніліся маліны і мядовы гуд пчаліны. | |
| 3 | Чорны дзяцел здаўна называецца жаўна. У чорнага волата- магутнае долата. | |
| 4 | У Алесі дзве касы, нібы з шоўку каласы. | |
| 5 | Люты ,напэўна, стаміўся, да шыбы маёй прытуліўся, заснуў… | |
| 6 | Янук глядзеў, як выраю<br>Струна<br>У неба з звонам таяла. | |

*Вучні каменціруюць знойдзеныя прыёмы.*

– Звернемся да тэмы ўрока: Простае шчасце людское… Што для кожнага з вас значыць ***шчасце***?

*(На дошцы размешчаны вучнёўскія выказванні,*
*ілюстрацыі іх разумення шчасця.*
*Яны даюць каментарыі сваім работам).*

– Так, у кожнага шчасце сваё. На маю думку, вялікую ролю ў тым, каб чалавек быў шчаслівы, іграе правільны выбар прафесіі. Дапаможа пашырыць разуменне чалавечага шчасця верш Максіма Танка “Я помню”.

**Мэты заняткаў**:
– пашырыць веды пра асобу паэта і рысы творчасці М. Танка;
– убачыць , як прыёмы паэтычнага сінтаксісу працуюць на раскрыццё ідэі твора;
– практычная работа па словаўтварэнні, вызначэнні лексічных разрадаў слоў, часцін мовы, сінтаксічным разборы сказа.

- Перад вамі ***рабочыя лісты***, у якіх вы павінны адзначаць тэрміны, з якімі мы сустрэнемся у час работы. Асаблівую ўвагу звярніце на новыя прыёмы.

**Рабочы ліст**

| *Раздзел мовазнаўства* | *Тэрміны* |
|---|---|
| *Лексіка* | |
| *Словаўтварэнне* | |
| *Сінтаксіс паэтычны* | |
| *Тэорыя літаратуры* | |
| *Фоніка* | |
| *Тропы* | |
| *Тэма* | |
| *Ідэя* | |
| *Творы сугучнай тэматыкі* | |

***Я помню***

*Я помню звычай старадаўні*
*Калі каго ў сяле хавалі,*
*Таму любімыя прылады*
*Заўсёды ў дамавіну клалі.*

*……. -яго сявеньку,*
*Стральцу- рог , што будзіў дубровы,*
*……. - бубен ці жалейку,*
*…… - гвозд ці падкову,*

*…… -капыл ці скрутак дратвы.*
*А ……… - коўш з дубіцай,-*
*Каб не з пустымі ім рукамі*
*Перад святым Пятром з'явіцца.*

*Таму і мне ў час развітання*
*Пяро з грамніцай дайце, дзеці,*
*Каб напісаў я вам пра тое,*
*Што ўсіх чакае на тым свеце.*

*Максім Танк*

*Знаёмства з тэстам.*

– Што вы ведаеце пра рысы творчасці М. Танка?

*Індывідуальнае паведамленне вучаніцы.*

- Свет паэзіі М.Танка – гэта няспынны **рух**, гэта **свет** вострых супярэчнасцей,напоўнены трывожным духам самаадмаўлення.

– Выступае **супраць спажывецкіх** адносін да Зямлі як калыскі чалавецтва.

Непакой за цябе, зямля мая,
За твой ураджай, спакойны сон,
За дрэва кожнае ў гаях,
За весніх песень пераразвон.

- Таму яго **зборнікі** носяць такія назвы:
"Мой хлеб надзённы", "Дарога, закалыханая жытам",
"Нарачанскія сосны"– узнагароджаны Ленінскай прэміяй,
"След бліскавіцы", "Глыток вады",
"Каб ведалі", "У дарозе""Хай будзе святло","Збор калосся".

– Сэнс сваё паэзіі М. Танк бачыць у цеснай **еднасці з жыццём людзей працы**.

– У многіх вершах гучыць **гімн жанчыне-маці**

Голас незнаёмага можа здзівіць.
Голас друга– на хвіліну спыніць,
Голас любай– сагрэць сонца летам,
Голас маці– вярнуць з таго свету.

– Паэта хвалююць вечныя **філасофскія** пытанні: жыццё і смерць, любоў і нянавісць, ісціна ,вера, дабро, сумленне.
– Адметная рыса – шырокі жанравы дыяпазон:балады, легенды, санеты, оды, прытчы.
- Важнае месца – вершы- ***верлібры***
– Пра які звычай гаворыць М. Танк?
– Паспрабуем аднавіць ,назвы якіх прафесій успамінае аўтар?Якія ж прылады каму клалі і што яны абазначаюць?

**Вызначце і суаднясіце лексічныя значэнні слоў**:

| | |
|---|---|
| 1.Дратва | 1. Сявенька-лубянка для ручной работы |
| 2. Дубіца | 2. Кавалак дрэваў форме ступні, на якім шавец робіць абутак |
| 3. Сявенька | 3. Тоўстая, моцна прасмоленая або навошчаная нітка для шыцця абутку і іншых скур |
| 4. Грамніца | 4. Дубільнае рэчыва, раствор |
| 5. Капыл | 5. Свечка, якую асвячаюць у касцёле ці царкве на Грамніцы (Стрэчанне) |

– Аднавіце тэкст верша поўнасцю. (*Яшчэ раз чытаецца верш*).
– Паспрабуем зрабіць словаўтваральны аналіз слоў, якія называюць прафесіі.
Дамавіна – спецыяльная скрыня, у якую кладуць нябожчыка.
Араты – земляроб. (ад *Араць*)
Стралец – ваеннаслужачы асобага войска. (ад *Страляць*)
Музыка – музыкант. (ад *Му́зыка*)
Каваль – займаецца коўкай металу. (*Каваць*)
Шавец – шые абутак. (*Шыць*)
Вінакур – займаецца вінакурэннем. (*Вінакурэнне*).
*Называем спосабы словаўтварэння, словаўтваральныя сродкі.*
– Як называюцца, словы значэнне якіх можна растлумачыць праз іншае слова?
*Матываваныя*
Назавіце такія словы ў вершы.
– Як называюцца ў мове лексічныя адзінкі, за якімі замацавалася ўстойлівае пераноснае значэнне?
*Фразеалагізмы*

**Здагадайцеся, якія фразеалагізмы растлумачаны ў правай калонцы.Падказка: ва ўсіх фразеалагізмах выкарыстына прылада працы з верша**.

| | |
|---|---|
| | Рабіць аднолькава |
| | Рабіць на свой манер |
| | Паваліцца, упасці стаміўшыся |
| | На чый -небудзь манер |

– Што абазначае слова ***грамніца*** ў вершы?
– У якіх лексічных адносінах знаходзяцца словы ***Грамніцы*** і ***грамніца***? (*Паронімы*)
- Назавіце слоўнікі паронімаў.
*1977 г. С. М. Грабчыкаў “Цяжкія выпадкі ўжывання блізкіх па гучанні слоў”.*
*1980 г. ”Міжмоўныя амонімы і паронімы”.*
*1994 г. “Слоўнік паронімаў беларускай мовы*”.

**- Выберыце патрэбныя прыметнікі і запішыце адпаведныя словазлучэнні**.
*Каўнер (вавёрчын, вавёркавы)*
*Лыжы (Сашавы, Сашыны)*
*Конь (заезны, заезджаны)*
*Майстэрства (пякарнае, пякарскае)*
*Неба (зорнае,зорчатае)*

– А якое слова можа мець амонім? (*Музыка*). Амограф-му́зыка. Які прыём называецца **перыфразай?** А ці ведаеце, што такое **эўфемізм?** (*Замена непрыстойнага ці непрыемнага слова больш далікатным або прыгожым.)* Знайдзіце ў вершы.
*У час развітання– смерці.*
- А вось прыём на ўзроўні фонікі, які дапамагае пазбегнуць немілагучнасці, называецца **эўфóнія.** Эўфонія ствараеццца дзякуючы алітэрацыям, асанансам, гукаперайманням.
– Якія прыёмы паэтычнага сінтаксісу выкарыстаны ў вершы? (*Сінтаксічны паралелізм).*
– Колькі сказаў у вершы? Што ўяўляе сабой трэці сказ? (2 і 3 страфа).
– Як называецца такое аб'яднанне? (*Перыяд*).
*Робім сінтаксічны разбор першага і другога сказаў*. Схемы, тып сказа.
– Якой часцінай мовы з'яўляецца слова *таму* ў вершы?(*Займеннік і прыслоўе*).
– Якой яшчэ можа быць у мове? (*Частка падпарадкавальнага злучніка **таму што***).
- Вызначаем **тэму верша**– *сутнасць чалавека вызначаецца справай, якой ён прысвяціў жыццё.*
*Вучні запаўняюць у рабочых лістах усю інфармацыю*.
**- Ідэя**– *праблема прызначэння мастака ў грамадстве.*
– Якое выказванне вы ўзялі б да водгуку на гэты верш? (*Дома яны падбіралі вершы М. Танка. Чытаюць і абгрунтоўваюць свае пазіцыі).*
– Звярніцеся, калі ласка да сваіх рабочых лістоў. Скажыце, з якімі новымі тэрмінамі вы сустрэліся на сённяшнім занятку?

**Дамашняе заданне.**

Заліковая работа

| | |
|---|---|
| У якім годзе нарадзіўся М. Танк | |
| За які зборнік узнагароджаны Ленінскай прэміяй | |
| Што агульнага ў вершах "Мой хлеб надзённы",<br>"Перапіска з зямлёй",<br>"Нарачанскія сосны",<br>"На камні жалезе і золаце" | |
| Які вершаваны жанр праславіў М. Танка | |
| Закончыце выраз:<br>Што самае цяжкае<br>На гэтым свеце?<br>І ён адказаў:<br>………… | |
| Напішыце ўступ водгуку на верш<br>" Я помню" М. Танка, выбраўшы пачатак:<br>1.Многае ў літаратуры пачынаецца з загалоўка …<br>2.Меў рацыю паэт…<br>3. Часта бывае ў жыцці …<br>4. Мяне заўсёды прываблівалі творы паэта пра… | |

**Сінтаксіс паэтычны – сістэма сінтаксічнай арганізацыі мовы**

**Ампліфікацыя** (накапленне) – сутнасць прыёма ў нагнятанні аднатыпных слоў ці моўных канструкцыі (эпітэты, параўнанні, злучнікі).
**Анафара** – адзінапачатак, паўтарэнне аднолькавых спалучэнняў, слоў, выразаў у пачатку вершаваных радкоў ці строфаў. Сінтаксічная анафара – паўтарэне ў пачатку радкоў аднолькавых сінтаксічных канструкцый.
**Антытэза** (супрацьпастаўленне) – супастаўленне процілеглых з'яў, прадметаў, характараў.
**Бяззлучнікавасць** (асіндэтон) – неўжыванне злучнікаў паміж граматычна аднароднымі словамі і сказамі. Сцісласць, хуткую змену падзей выражае.
**Градацыя** – у вершаваных радках групуюцца словы ці выразы з нарастаннем ці аслабленнм эмацыянальнай выразнасці.
**Інверсія** – парушэне звычайнага граматычнага парадку.
**Паралелізм** – паралельнае размяшчэнне аднатыпных элементаў паэтычнага выказвання. Аднолькавая сінтаксічная будова суседніх вершаваных радкоў і строф.
**Паўтор** – фіксуе увагу чытача на пэўных рытмічных, сінтаксічных кампанентах твора і тым самым павялічвае іх эмацыянальнае ўздзеянне.
**Перанос (амбежаман**) – калі сінтаксічна цэлае словазлучэнне, пачатак якога знаходзіцца ў адным вершаваным радку, заканчваецца ў наступным. На раздзеленае словазлучэнне падае лагічны націск.Ствараецца размоўная сітуацыя. Перадаецца эмацыянальная напружанасць.
**Перыяд сінтаксічны** – складаная сінтаксічная адзінка з адным галоўным і некалькімі даданымі сказамі, якая ахопліва шэраг вершаваных радкоў або строфаў.
**Рытарычныя фігуры**– рытарычнае пытанне, рытарычны зваротак, рытарычны вокліч.
**Рэтардацыя** – запаволенне якіх-небудзь падзей ці з'яў. У вершах узнікае ў разгорнутых сінтаксічных перыядах, дзе галоўны сказ разбіваецца на дзве часткі:першая знаходзіцца ў пачатку перыяду, а заключная ў канцы яго. ("Каб ведалі" М. Танк).
**Таўталогія** – паўтарэнне ў вершаваным творы блізказначных слоў або выразаў.
**Умаўчанне** – раптоўны перапынак у паэтычным мышленні, падкрэслены інтанацыйна і графічна абазначаны шматкроп'ем.
**Полісіндэтон (шматзлучнікавасць**) – выкарыстанне адных і тых жа злучнікаў паміж аднароднымі словамі і сказамі.
**Эліпсіс** – пропуск у паэтычнай фразе нейкага слова,якое лёгка аднаўляецца з кантэксту.
**Эпіфара** – паўтарэнне аднолькавых гукаў, слоў, выразаў у канцы вершаваных радкоў або строфаў.
**Эўфонія** (мілагучнасць) – прыгажосць і натуральнасць гучання вершаванай мовы. Эўфонія ствараецца дзякуючы алітэрацыям, асанансам, гукаперайманням.
**Рэмінісцэнцыя** – наўмыснае ўзнаўленне пісьменнікам вобразаў,асобных выказванняў іншых аўтараў.
**Перыфраза** – назва з'яў, прадметаў падаецца праз апісанне іх асобных вызначальных прымет.